ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
«ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ, МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ»

Аб’ект аўтарскага права

УДК 398: 556.5 (= 161.3)

**НЕНАДАВЕЦ**
**Ягор Аляксеевіч**

# ВОДНАЯ ПРАСТОРА Ў БЕЛАРУСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ: СЕМАНТЫКА, СІМВОЛІКА, ФУНКЦЫЯНАЛЬНАСЦЬ

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.09 – фалькларыстыка

Мінск, 2023

Работа выканана ў аддзеле нарадазнаўства ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік: | **Лакотка Аляксандр Іванавіч**, доктар гістарычных навук, доктар архітэктуры, прафесар, акадэмік ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» |
| Афіцыйныя апаненты: | **Новак Валянціна Станіславаўна**, доктар філалагічных навук, прафесар кафедры рускай і сусветнай літаратуры УА “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”.<br>**Прыёмка Вольга Віктараўна**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры тэарэтычнага і славянскага літаратуразнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. |
| Апаніруючая арганізацыя: | **УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка”.** |

Абарона адбудзецца 2 0 снежня 2023 года ў 11.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацыі Д.01.42.01 пры ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літэратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» па адрасе: 220072 г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2, ауд. 302; тэлефон вучонага сакратара: 270-29-24; E-mail: tyapkova-anna@mail.ru.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі».

Аўтарэферат разасланы «20» 11 2023 г.

Вучоны сакратар савета па абароне дысертацый, кандыдат гістарычных навук, дацэнт — Г. І. Цяпкова

# УВОДЗІНЫ

Адзін з галоўных пластоў духоўнай культуры (міфалагічна-фальклорны) складаюць прыродныя стыхіі (вецер, вада, зямля, агонь). Дадзеная работа прысвечана разгляду вобраза вады, воднай прасторы ў беларускім фальклоры. Гісторыя развіцця народаў свету пераканаўча сведчыць пра тое, што ўвайсці і потым замацавацца ў сусветнай супольнасці пэўная нацыя можа толькі праз захаванне і прыўнясенне ў агульны духоўны здабытак уласных характэрных асаблівасцяў, непаўторных рыс сваёй міфалагічна-фальклорнай адметнасці. Прывязанасць да асобнай духоўнай культуры – неабходная перадумова самабытнасці жыцця народа, пачатковы этап уваходжання ў сусветную культуру. Таму на сённяшнім этапе паўстала неабходнасць больш глыбока і падрабязна асэнсаваць беларускую традыцыйную вуснапаэтычную спадчыну, вылучыць асноўныя фактары, якія прывялі да дасканаласці і ўстойлівасці (фундаментальнасці) нацыянальнага фальклору на працягу значнага перыяду.

Духоўная культура, а менавіта фальклорныя творы, перадаюцца з пакалення ў пакаленне, з’яўляюцца сведчаннем паступовага развіцця грамадства на розных этапах, уключаючы яго нацыянальную самасвядомасць, адносіны да сям’і, прыроды, Радзімы. Агульнапрызнана, што на духоўнае выхаванне людзей аказвае ўплыў фальклорная спадчына. Таму яна выконвае адну з важных роляў у фарміраванні нацыянальнага светаразумення і светасузірання.

Актуальнасць тэмы даследавання вызначаюць наступныя аспекты: 1) у апошні час да вывучэння воднай прасторы звярталіся вядомыя беларускія даследчыкі: А. Алфёрава, Т. Кухаронак, А. Ненадавец, В. Новак, Т. Рабец, Л. Салавей, В. Шарая, І. Швед і іншыя фалькларысты, этнографы і этнолагі, але закраналі яны толькі некаторыя аспекты. Можна канстатаваць адсутнасць сістэматызаванага і класіфікаванага аналізу семантыкі воднай прасторы ў кантэксце жанравай спецыфікі; 2) наяўнасць багатага матэрыялу, які патрабуе сістэмнага вывучэння, што дазволіць паглыбіць, удакладніць і ўдасканаліць сучасныя веды па разнастайных аспектах духоўнага багацця беларускага народа; 3) неабходнасць больш глыбока ўнікнуць у разуменне агульнай усходнеславянскай трансфармацыі сюжэтаў і матываў, дадаткова распрацаваць сістэму ўяўленняў народа пра пэўныя перыяды светабудовы і светаадлюстравання; 4) магчымасць паўней прааналізаваць і зразумець каштоўнасць фальклору ў галіне гісторыка-духоўнай спадчыны беларусаў.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.**

Тэма дысертацыйнага даследавання распрацоўвалася ў рамках задання 1.2.05. «Сучасныя этнічныя традыцыі Рэспублікі Беларусь» падпраграмы № 1 «Гісторыя і культура» ДПНД на 2016-2020 гг. «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» і задання 2.4. НДР 1 «Развіццё нацыянальнай ідэнтычнасці этнічных супольнасцей Рэспублікі Беларусь» у рамках ДПНД на 2021-2025 гады «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» падпраграма № 2 «Культура і мастацтва». Тэма дысертацыі адпавядае прыярытэтнаму накірунку № 6 «Забеспячэнне бяспекі чалавека, грамадства і дзяржавы: сацыягуманітарная, эканамічная і інфармацыйная бяспека» прыярытэтным накірункам навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2021-2025 гг., зацверджаных Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20.05.2020 № 156.

**Мэта і задачы даследавання**

**Мэтай** дысертацыйнай работы з'яўляецца выяўленне семантыкі, сімволікі і функцыянальнасці воднай прасторы ў беларускім традыцыйным фальклоры на аснове сучасных дасягненняў айчыннай і замежнай фальклnetwork фалькларыстыкі, культуралогіі, гісторыі, этналінгвістыкі. Для дасягнення пастаўленай мэты вызначаны наступныя **задачы:**

- акрэсліць спецыфіку фарміравання канцэпта вады ў беларускай вуснапаэтычнай спадчыне;
- вызначыць і інтэрпрэтаваць сімвалічную атрыбутыку і прэдыкатыўнасць фальклорных вобразаў рэк, азёр, крыніц;
- выявіць спецыфіку міфапаэтычнай сімволікі ў тых традыцыйных жанрах беларускага фальклору, дзе водная прастора сустракаецца найбольш часта;
- актуалізаваць прынцыпы сістэмнага падыходу да вывучэння народных вераванняў, звязаных з воднай прасторай, у беларускім фальклоры;
- вывучыць сістэмную сутнасць, уласцівасці і асноўныя параметры канцэпта “вада” і яго вобразных увасабленняў.

**Аб’ектам** даследавання з’яўляецца міфалогія, абраднасць, вуснапаэтычная творчасць беларусаў. **Прадметам** дысертацыйнага даследавання выступаюць семантыка, сімволіка і функцыянасць воднай прасторы ў фальклорных жанрах.

**Навуковая навізна.** Упершыню ў беларускай фалькларыстыцы праведзена комплекснае даследаванне воднай прасторы ў нацыянальнай міфалогіі і вуснапаэтычнай творчасці, што дазволіла растлумачыць яго як неад'емную частку самабытнай традыцыйнай культуры, функцыянальна скіраваную на глыбокае асэнсаванне стыхійных праяў рэальнага свету. Упершыню цэласна ахарактарызаваны павер'і пра ваду ў шэрагу каляндарных абрадаў і іх семантычная напоўненасць: раскрыты дамінантныя прыкметы, выяўлена спецыфіка кампанентаў; акрэслены сацыяльна-гістарычныя прычыны і напрамкі структурнай і змястоўнай трансфармацыі беларускіх абрадаў і жанраў фальклору, звязаных з вадой; выяўлены і прааналізаваны фальклорныя жанры з воднай прасторай у складзе беларускіх абрадаў і сімвалічна-рытуальных дзеянняў, раскрыты адметнасці мастацкіх сродкаў вербальных тэкстаў беларускай народнай творчасці.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Для воднай прасторы ў беларускай міфалогіі і традыцыйным фальклоры характэрны надзвычай багатая якасная, лічбавая, колеравая, элементавая, прадметная, прыродна-ландшафтная, персанажная, а ў пэўных выпадках псіхалагічная атрыбутыка і прэдыкаты з семантыкай актыўнага дзеяння ці пэўнага знешняга ўздзеяння. Атрыбуты і прэдыкаты – знакі адносін, прызначанасці – функцыянуюць як акрэслены сімвалічны код, генетычна звязаны са старажытнымі ўяўленнямі аб светабудове і месцы ў ёй вады (акіян-мора, рака, возера, ручай-крыніца).

*Упершыню ў айчыннай фалькларыстыцы на базе навукова абгрунтаваных метадалагічных крытэрыяў, якія даюць магчымасць аналізаваць сімвалы ў кантэксце даследаванай тэмы і сімвалічнай сістэмы вуснапаэтычнай творчасці ў цэлым, вызначана і патлумачана атрыбутыка і прэдыкатыўнасць водных сімвалаў беларускай міфалогіі і традыцыйнага фальклору.*

2. Сістэмны падыход даў магчымасць даследавання воднай прасторы беларускага традыцыйнага фальклору ў адпаведнасці з наступнымі прынцыпамі: вывучэнне не асобных аспектаў («жывая» і «мёртвая» вада, крыніцы), а іх сукупнасці (узаемасувязі); сінтэз тэарэтычных уяўленняў (гісторыка-генетычных і функцыянальна-семантычных) пра водную стыхію нашых продкаў; пералічэнне фактараў, якія надаюць воднай прасторы ўстойлівасць, акцэнтуюць увагу на злучанасці сімвалаў; зварот да канцэпцый утварэння светабудовы (зямлі і вады), яе мадэлявання. Мадэль светабудовы (зямлі і вады), карціна свету, вобраз, сімвал з'яўляюцца абавязковай асновай

сістэмнага разгляду генезісу і функцыянавання воднай прасторы – аднаго з важнейшых сродкаў традыцыйнага мадэлявання свету на аснове яго пазнання, ацэнкі і апісання праз адпаведныя сімвалы, якія і ўтваралі ў старажытнасці трывалую сістэму адносін.

*Упершыню вылучаны і прааналізаваны сімвалы воднай прасторы, разгледжана іх роля пры ўтварэнні светабудовы, захаванасць згаданай тэматыкі ў фальклорных творах.*

3. Змястоўнай базай фарміравання воднай прасторы ў беларускай вуснапаэтычнай творчасці выступае комплекс анталагічных і прагматычных прыкмет, што характарызуюць ваду ў розных аспектах (стан, якасныя і колеравыя параметры). Найважнейшыя аб’екты ўвасаблення воднай прасторы: акіян, мора, возера, рака, калодзеж – з’яўляліся для чалавека менавіта той стыхіяй, да якой ён мог звярнуцца па дапамогу ці адасланць на яе свае хваробы. Гэта тая сетка асацыятыўных комплексаў, эквіваленцый і апазіцый, уключаных у змест канцэпта “вада”, і асобных элементаў іншых кодаў з абавязковым улікам згаданых характарыстык, якая выступае, з аднаго боку, асновай фарміравання спалучальнасці водных сімвалаў, а з іншага – самаабумоўліваннем іх семантыкі.

*Навуковая навізна заключаецца ў тым, што водная прастора ўпершыню становіцца асобным аб’ектам разгляду беларускай этнафалькларыстыкі, які раней у сувязі з абраным прадметам даследавання вывучаўся ў галінах розных навук – этналінгвістыцы, этнаграфіі, міфалогіі, фалькларыстыцы, семіётыцы, культуралогіі.*

4. Вада (у «сакральна» і «прафанна» арыентаваных версіях міфалагічнага вобраза) прадстаўляе цесна звязаныя, узаемадапаўняльныя ў міфапаэтычным мысленні канцэпты нараджэння-тварэння, смерці-дэструкцыі і абнаўлення-адраджэння. У водных сімвалах атрымалі канкрэтызаваную формулу ўяўленні пра племя-род, працяг роду, лёс, шчасце, дабрабыт, магічную далучанасць чалавека да свайго і чужога («таго») светаў і г. д. З медыятыўным, прадуцыравальным значэннямі вобразаў як «жывой», так і «мёртвай» вады звязаны і адпаведныя магчымасці рэалізацыі імі родава-шлюбнай сімволікі. Таму такі значны элемент традыцыйнай карціны свету беларусаў, як водная прастора, пакуль што не выглядаў цэласным і поўным. У дысертацыі сімволіка вады ў беларускім фальклоры вывучана ў сінкрэтычным адзінстве з улікам паходжання, станаўлення і развіцця.

*Упершыню высветлены і вывучаны ў сінкрэтычным адзінстве водныя сімвалы, якія атрымалі канкрэтнае разуменне ў суаднесенасці з паняццямі пра племя-род, працяг роду, сям’ю, лёс, шчасце, дабрабыт і іх сувязі.*

5. Надзвычай важнае значэнне вадзе надавалася і ў будзённым жыцці чалавека, асабліва з улікам шматлікіх лекавых, замоўных функцый вадкасці, якія з цягам часу ўводзіліся продкамі ў ранг культаў, рытуалаў. Усё гэта набывала ступень шанавання, святасці, абагаўлення вады, што знайшло сваё адлюстраванне ў розных жанрах беларускага фальклору.

*Упершыню акцэнтавана ўвага на вадзе не толькі як адной з галоўных стыхій, але і як сродку дапамогі ў розных жыццёвых сітуацыях.*

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Дысертацыя з'уляецца самастойным тэарэтычным даследаваннем, праведзеным на аснове ўласнай канцэпцыі аўтара. Гэтаму спрыяў комплексны аналіз палявых экспедыцыйных запісаў (2004 – 2023), зробленых аўтарам па тэрыторыі Беларусі. Упершыню ўведзены ў навуковы ўжытак фальклорныя і этнаграфічныя матэрыялы, што знаходзяцца ў айчынных архівах і лабараторыях. Гэта дало магчымасць вызначыць генезіс і функцыянаванне воднай прасторы як каштоўнага сродку мадэлявання традыцыйнай карціны свету беларусаў, выявіць яго сістэмны характар, прасачыць семантыку канкрэтных водных сімвалаў праз адносіны да сумежных і апазіцыйных адпаведнікаў, устанавіць асаблівасці ўплыву міфапаэтычнай сімволікі на жанры беларускага фальклору.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання былі прадстаўлены і абмяркоўваліся на міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях: «Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XX стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы» (Гомель, 2009); Матэрыялы XXIV навуковай канферэнцыі «Каласавіны. Якуб Колас і яго сучаснікі» (Мінск, 2009); Матэрыялы XXV навуковай канферэнцыі «Каласавіны. Якуб Колас і яго сучаснікі» (Мінск, 2010); «IX Шырмаўскія чытанні» (Мінск, 2010); «Роля традыцыйнай народнай культуры ў адраджэнні беларускага сяла» (Мінск, 2010); Материалы международной научно-практической конференции «Этнокультурное развитие Беларуси в XIX – начале XXI в.» (Минск, 2011); Матэрыялы XXVI навуковай канферэнцыі «Каласавіны. Якуб Колас і яго сучаснікі». (Мінск, 2012); Матэрыялы XXVII навуковай канферэнцыі «Каласавіны. Якуб Колас. Чалавек. Эпоха. Час». (Мінск, 2012); Матэрыялы III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі Міжнародныя Шамякінскія чытанні. «Пісьменнік – асоба – час» (Мазыр, 2013); «Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў» (Мінск, 2016); «Традыцыі і сучасны

стан культуры і мастацтваў» (Мінск, 2021); зборнік матэрыялаў Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 2022); «Беларуская этнаграфія, этналогія і антрапалогія»: зборнік навуковых артыкулаў (Мінск 2023).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Матэрыялы і вынікі даследавання знайшлі адлюстраванне ў 26 публікацыях аўтара: 10 навуковых артыкулах у часопісах, рэкамендаваных ВАК, аб’ёмам 4,1 аўт. арк., 13 артыкулах у зборніках навуковых прац і зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый аб’ёмам 2,9 аўт. арк. Кніжныя выданні: 16 аўт. арк. Публікацыі ў калектыўнай манаграфіі 6,2 аўт. арк. Агульны аб’ём публікацый складае 29,2 аўт. арк.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу. Агульны аб’ём работы – 139 старонак, з іх 97 старонак займае асноўны тэкст. Спіс крыніц, выкарыстаных пры напісанні работы, складае 11 старонак і змяшчае 150 адзінак, у тым ліку 26 уласных публікацый саіскальніка.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **ўводзінах** і **агульнай характарыстыцы работы** раскрываецца актуальнасць тэмы, акрэсліваецца навуковая навізна даследавання, вызначаецца сувязь з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі, фармулююцца мэта і задачы, палажэнні, якія выносяцца на абарону, акрэсліваюцца асабісты ўклад саіскальніка, апрабацыя і апублікаванасць вынікаў дысертацыі, яе структура і аб’ём.

У першай главе **«Тэарэтыка-метадалагічныя праблемы даследавання вобраза вады»** дадзены агляд навуковых прац, прысвечаных вывучэнню канцэпту “вада”, воднай прасторы, разглядаюцца выкарыстаныя крыніцы, характарызуецца тэарэтыка-метадалагічная база работы.

У раздзеле 1.1 **«Аналітычны агляд крыніц»** звяртаецца ўвага на тое, што вывучэнне воднай прасторы адбывалася па некалькіх напрамках: 1) першапачатковая апрацоўка і публікацыя фактычнага матэрыялу (А. Багдановіч, І. Берман, М. Нікіфароўскі, Е. Раманаў, А. Сержпутоўскі, П. Шэйн), тэарэтычнае асэнсаванне пачалося з прац Я. Карскага, І. Насовіча;

2) абагульненне і гісторыка-тэарэтычнае асэнсаванне тэкстаў (Р. Шырма, Н. Гілевіч, К. Кабашнікаў і інш.).

Для беларускіх даследчыкаў вады, воднай прасторы станавілася аб’ектам канкрэтнай увагі (У. Васілевіч, А. Ненадавец, В. Шарая, І. Швед і інш.). Узмацняўся ў гэтым кірунку тэарэтычны аналіз вуснапаэтычных адзінак, сістэматызаваліся самі творы беларускага фальклору, удасканальвалася метадалогія.

Тэарэтычнай і метадалагічнай асновай праведзенага даследавання сталі прынцыпы аб’ектыўнасці і навуковасці. Таксама падчас працы выкарыстоўваліся сістэмна-тыпалагічны і параўнальна-гістарычны падыходы, якія ўключаюць у сябе структурна-тыпалагічны і параўнальна-гістарычны метады. Іх спалучэнне неабходна для таго, каб прасачыць асаблівасці інтэрпрэтацыі, занатаваныя ў падсістэмах даследаванай тэмы, і змястоўную напоўненасць, функцыянальнасць традыцыйнай сімволікі ў народнай творчасці.

У раздзеле 1.2 **«Тэарэтычнае асэнсаванне канцэпту “вада” ў працах замежных даследчыкаў»** вызначаюцца асноўныя працы замежных фалькларыстаў (рускіх вучоных – А. Афанасьеў, П. Гільтэбрант, У. Дабравольскі, С. Максімаў, І. Сахараў, М. і С. Талстыя; польскіх даследчыкаў: Э. Яленская, М. Федароўскі, К. Машынскі, Ч. Пяткевіч, Ф. Сяліцкі), прысвечаныя вывучэнню воднай прасторы, выкліканню ці спыненню дажджу, абрадаў, звязаных з вадой на тэрыторыі Беларусі.

У другой главе **«Семантыка і сімволіка вобраза вады ў традыцыйным фальклоры беларусаў»** разглядаецца спецыфіка мастацкіх і паэтычных асаблівасцей вобраза вады, уключанага ў розныя творы народнай вуснапаэтычнай спадчыны. Тэксты, якія вывучаюцца, маюць вялікія выяўленчыя магчымасці, што дазваляюць стварыць аб’ёмную мастацкую карціну і вызначыць у ёй функцыі і месца канцэпта “вада”.

У раздзеле 2.1 **«Семантыка і знакавасць воднай прасторы ў сферы каляндарнай абраднасці»** апісваюцца абрады скіраваныя на выклікане дажджу або, наадварот, яго спыненне. У старажытным грамадстве з’яўленне нябеснай вільгаці нельга было растлумачыць, выкарыстоўваючы наяўныя на той час веды. Для таго, каб рэгуляваць паступленне атмасферных ападкаў ці выклікаць іх з’яўленне, заўсёды існавалі своеасаблівыя абрады, прыкметы, павер’і, звычаі. Найбольш шырока былі распаўсюджаны ў беларусаў абрады выклікання дажджу. Амаль паўсюдна яны грунтаваліся на імітацыйнай магіі. Што тычыцца засухі, то яна асацыіравалася ў вуснапаэтычнай творчасці з

чараўніцтвам (варажбой), з тым, што гэта было падроблена кімсьці з людзей на зло іншым.

У раздзеле 2.2 **«Змястоўныя кампаненты і сімволіка вады ў сямейна-бытавой абрадавай паэзіі»** разглядаецца вобраз вады, які, па меркаваннях старажытных продкаў, ачышчаў ад усемагчымых сурокаў і хвароб, бо валодаў цудадзейнымі ўласцівасцямі. Вада разам з агнём, што таксама выступаў магутнай стыхіяй, пры здзяйсненні ачышчальных абрадаў ці магічных маніпуляцый станавілася на вядучую пазіцыю. У дадзеным выпадку на першы план выходзіла апатрапейная функцыя воднай стыхіі: засцеражэнне ад эпідэмій, паморкаў, хвароб; уздзеянняў чароўнай сілы (чараўнікоў, варажбітоў); захаванне ад смерці ў надзвычай складаных і небяспечных жыццёвых сітуацыях (падчас далёкіх вандровак ці ваенных паходаў). Немалаважным было і ачышчэнне пасля вяртання чалавека з далёкіх краін дадому. У старадаўнія часы людзі верылі ў тое, што ім неабходна мець магічнае змыванне-ачышчэнне ад усяго вышэйпералічанага, бо калі нехта выжываў і без усемагчымых дзеянняў-абрадаў, то страшныя прыродныя катаклізмы ці жыццёвыя нягоды маглі абрынуцца на яго нашчадкаў. Такое ў вачах патрыярхальных людзей, было значна большым няшчасцем, чым тое, калі ад нявыкананых неабходных рытуалаў пакутаваў асобны, канкрэтны чалавек.

У раздзеле 2.3 **«Комплекс “жывая-мёртвая” вада ў чарадзейных казках»** аналізуюцца казкі, звязаныя з жывой і мёртвай вадой, якая адыгрывае вялікую ролю ў жыцці казачных герояў (станоўчага ці адмоўнага персанажа). Мастацкая спецыфіка тэкстаў вызначаецца іх эпічнасцю і драматызмам, створаных пры дапамозе персаніфікацыі.

«Жывая» вада, зыходзячы з семантыкі назвы, выкарыстоўвалася галоўным героем для аднаўлення сіл або ажыўлення мёртвага чалавека. У сваю чаргу, «мёртвая» вада гэтых сіл пазбаўляла і забівала. Але ў некаторых варыянтах «мёртвая» вада дапамагала загаіць раны, зрасціць цела. У выніку аналізу значнай колькасці тэкстаў беларускага фальклору адзначым, што вобраз «жывой» і «мёртвай» вады распаўсюджаны ў замовах і чарадзейных казках, у іншых жанрах ён амаль не сустракаецца.

Раздзел 2.4 **«Прэзентацыя вобраза вады ў беларускіх замовах»** прысвечаны аналізу замоў, звязаных з жывой і мёртвай вадой. Канцэпт “вада” мае глыбокія генетычныя сувязі з даўнімі пластамі традыцыйнай песеннай творчасці. Замовы выконвалі важныя функцыі ў грамадскім і гаспадарчым побыце. Вымаўляючы словы замоў, прашчур быў цвёрда

перакананы, што вада дапаможа яму вылечыць тую ці іншую хваробу. З духоўнага боку, ён свята верыў у першастваральную стыхію, што яна не пакіне яго ў цяжкую гадзіну. Мастацкі час у творах не мае дакладна акрэсленых рамак: дзеянні пераносяцца то ў мінулае, то ў будучае. Спосаб рэалізацыі тых ці іншых функцый мастацка-паэтычных сродкаў у прыкметах і павер'ях пра водную прастору мае складаны характар і ўплывае на вырашальнае значэнне пры фарміраванні сэнсаў даследуемых тэкстаў.

У трэцяй главе **«Функцыянальны і аксіялагічныя аспекты вобраза вады ў вуснай народнай творчасці беларусаў»** разглядаюцца павер'і пра рэкі, у якіх фіксуюцца сацыякультурныя рэаліі, звязаныя ў разуменні беларускага народа з тэрмінам «мяжа».

У раздзеле 3.1 **«Аксіялагічны складнік вобраза вады ў малых жанрах беларускага фальклору»** аналізуецца вобраз вады і воднай прасторы ў прыказках і прымаўках, загадках, выслоўях, фразеалагізмах. Гэтымі малымі жанрамі беларускага фальклору карыстаюцца ў паўсядзённасці амаль усе людзі. Вада, водная прастора шырока прадстаўлена ў названых парэміях. Закранаюцца розныя з'явы чалавечага жыцця – праца, родны край, лянота, п'янства і г.д. Вада для людзей, у нейкім плане, з'яўляецца неад'емным атрыбутам, які дапамагае ім у паўсядзённасці, у гаспадарцы, але сустракаюцца неспрыяльныя моманты для чалавека, калі наадварот – вада губіць, а дождж шкодзіць.

У раздзеле 3.2 **«Змястоўна-функцыянальны сэнс "зямной вады"»** падкрэсліваецца, што водная стыхія ва ўяўленнях продкаў валодала не толькі жыццядайнай, ажыўляючай сілай, але і сваёй пранікальнасцю, здольнасцю прынесці вялікую шкоду земляробу. Вада не ведала межаў, і гэта давала падставы для ўсемагчымых дадатковых асацыяцый.

Пры здзяйсненні розных абрадаў па выклікanні і спыненні дажджу, чалавек быў упэўнены ў тым, што прырода чуйна адносіцца да яго просьбаў і маленняў і яна (нябесная вільгаць) стане дапамагаць, выручаць і падтрымліваць. Дождж заўсёды ўспрымаўся прашчурамі, як персаніфікаваная стыхія, якую можна было ўпрасіць, запалохаць, пераманіць на свой бок.

Цудадзейныя магчымасці звязаныя з першым веснавым дажджом, з яго засцерагальнымі і лекавымі функцыямі, захаваліся да нашага часу, а некаторыя парады шырока ўжываюцца ў народнай медыцыне.

«Здароўчыя» здольнасці вады, яе ачышчальныя ўласцівасці прымяняліся ў радзінным абрадзе, у «змыванні» ўсялякіх дзіцячых хвароб («урокаў», «начніц», «крыксаў-плаксаў»). Немалаважную ролю вада

адыгрывала і ў народных замовах, скіраваных на засцеражэнне, вылячэнне і памнажэнне свойскай жывёлы.

У раздзеле 3.3 **«Лакатыўныя характарыстыкі «святых» азёр і крыніц у беларускім фальклоры»** на прыкладзе беларускіх народных уяўленняў паказваецца, што вада – гэта выток і пачатак усяго існага, эквівалент першабытнага Хаосу, з нетраў якога нараджаецца ці ствараецца зямля. Згодна з некаторымі нашымі этымалагічнымі паданнямі, зямля ўзнікла з пяску, здабытага на дне першаснага акіяна. Ваду справядліва падзялялі на нябесную і зямную. Да першай адносілі дождж. А да другой – рэкі, азёры, крыніцы і балоты.

Святасць вады, воднай стыхіі, якая заўсёды шанавалася і абагаўлялася, мела вырашальнае значэнне для надання нейкіх «святых» рыс ці ўласцівасцей самім першакрыніцам. Лекавыя якасці крынічнай вады людзі заўважылі яшчэ ў глыбокай старажытнасці. Пасля прыняцця хрысціянства царква ўзяла пад сваю апеку большасць крыніц, якія ўшаноўвалі нашы продкі.

Вобраз вады знайшоў сваё шырокае адлюстраванне ў назвах крыніц і азёраў Беларусі, звязаных з пакланнем вадзе, з яе ачышчальнымі і лекавымі функцыямі. Самі тэрміны «святы», «святая», «святое», «святасць» – набытак больш позняга перыяду, калі на змену язычніцтву на нашых землях прыйшло хрысціянства.

Народна-рэлігійнымі святамі, якія адлюстроўваюць і ў наш час веру ў «святую сілу жывой і намоленай вады», з’яўляюцца Вадохрышча і Чысты чацвер. Народ па-ранейшаму працягвае верыць у жыццядайную сілу вады, у яе здольнасць супрацьстаяць розным хваробам і паморкам.

Раздзел 3.4 **«Функцыянальны і аксіялагічны кампанент вобраза Дуная ў беларускім фальклоры»** прысвечаны міфічна-родавай рацэ – Дунаю. Вада, з’яўляючыся жыццёвай неабходнасцю, у многім абумоўлівала рассяленне плямёнаў або народаў. Любы род пасяляўся паблізу буйной (ці не надта) воднай артэрыі. Гэтая акалічнасць дыктавалася тым, што вада, па-першае, была патрэбна для піцця; па-другое, больш хуткімі і выгаднымі шляхамі зносін паміж плямёнамі былі водныя камунікацыі; па-трэцяе, узводзячы паселішчы, першапродкі абавязкова звярталі ўвагу на тое, каб рака (возера) станавілася адначасова і цяжкапераадольнай перашкодай на выпадак нападу ворагаў; па-чацвёртае, не выключана і тое, што тэрыторыя, размешчаная паміж дзвюма буйнымі рэкамі, у памяці народа трывала замацоўвалася за нейкім канкрэтным родам ці племенем.

У даўнія часы рэкі выступалі ў якасці своеасаблівых межавых граніц, захаваных не толькі ў свядомасці далёкіх продкаў, але і шматлікіх княжацкіх дамовах ужо ў значна пазнейшы гістарычны перыяд.

Часта назва ракі Дунай сустракаецца ў баладах, сямейна-бытавой лірыцы і вясельных абрадах. Прычым Дунай тут выступае як адухоўленая істота, да якой звяртаюцца за парадамі, з просьбамі. Разам з тым ён можа выступаць абагульненым пазначэннем ракі ўвогуле, набываць асаблівы сімвалічны сэнс. Такая рака падзяляла тэрыторыю двух родаў, двух бакоў – мужчынскага і жаночага.

У беларускім фальклоры Дунай па-ранейшаму цесна звязваўся з геаграфічнай ракой з аднайменнай назвай – прарадзімай славян.

У раздзеле 3.5 **«Вобраз ракі-мяжы ў вуснапаэтычнай творчасці беларусаў»** адзначаецца, што дадзеныя тэксты з’яўляюцца вуснапаэтычнай крыніцай, у якой Дунай-рака падзяляе не суседнія роды-плямёны, а народы, краіны. Пераступіць такую мяжу, парушыць спрадвечную граніцу, азначала ні што іншае, як пачаць вайну. У традыцыйнай культуры, заўсёды з такой ракой асацыіраваўся Дунай.

Дунай нярэдка ўяўляў сабой своеасаблівы цэнтр, да якога імкнуліся ўсе іншыя рэкі («сцякаліся воды»). За ім, паводле народных вераванняў, ляжыць таямніча-міфічная, напоўненая ўсемагчымымі каштоўнасцямі («срэбрам-золатам») зямля. Яна і прыцягальная, але і надзвычай небяспечная. Адтуль амаль ніхто і ніколі не вяртаецца. Тут Дунай выступае размежавальнікам «сваёй і чужой тэрыторыі».

У песенным меласе Дунай можа асацыіравацца з алегарычным вобразам смерці. Так, у баладах і сацыяльна-бытавых песнях пазначаецца, што там «казак топіцца» ці «ўтапіўся». У дадзеных творах рака часта ўяўляецца міфічнай дарогай у іншасвет, які лакалізуецца на супрацьлеглым беразе, або на безназоўным востраве пасярод «сіняга мора». У такім кантэксце Дунай мог сімвалізаваць плынь часу, вечнасць і забыццё. Такая рака супастаўляецца з уяўленнемі пра смерць, страх перад невядомым.

У некаторых вуснапаэтычных творах замест абагульнена-міфалагічнай назвы Дунай з’яўляюцца назвы рэальных беларускіх рэк (Прыпяць, Нёман), што ўказвае на канкрэтную гістарычную падзею і на пэўную геаграфічную тэрыторыю, дзе яна адбывалася.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

У выніку праведзенага даследавання можна зрабіць наступныя высновы:

1. Сімвалічныя ўласцівасці вады, як сведчыць асэнсаваны фактычны матэрыял, знайшлі яскравае адлюстраванне ў многіх фальклорных жанрах і абрадах. Семантыка воднай прасторы ў беларускім фальклоры выяўляецца на ўзроўні яе асэнсавання ў кантэксце даследавання пэўных атрыбутаў (якасных, лічбавых, колеравых і г.д.) як знешніх прыкмет і асаблівасцей фунцыянавання, што ў цэлым і дазваляе вызначыць водную прастору як аксіялагічна-сэнсавую канстанту беларускага фальклору.

Атрыбуты і прэдыкаты функцыянуюць як акрэслены сімвалічны код, генетычна звязаны з уяўленнямі старажытнага насельніцтва Беларусі аб Светабудове і месцы ў ёй асобных аб’ектаў воднай прасторы (акіян-мора, рака, возера, ручай-крыніца).

На падставе тэарэтычных распрацовак апошніх дзесяцігоддзяў у галіне міфалогіі, фалькларыстыкі, гісторыі, этналогіі і матэрыялах асабістых палявых даследаванняў разгледжаны абрады выклікання дажджу; павер’і, звязаныя з цудадзейнымі ўздзеяннямі першага веснавога дажджу; ачышчальная і лекавая ўласцівасці вады; роля вады ў замовах; атаясамленне ракі Дунай у беларускім фальклоры з прарадзімай славян; святасць крыніц [А-2, А-3, А-4, А-7, А-8, А-9, А-11, А-12, А-13, А-14, А-18, А-21].

2. Даследаванне воднай прасторы беларускага традыцыйнага фальклору праводзілася сістэмна: вывучаліся сукупнасці розных аспектаў звязаных з семантыкай вады, і іх ўзаемасувязі, што і ўтвараюць сам гідралагічны код; уяўленні пра водную прастору нашых продкаў; дакладнае пералічэнне выяўленых фактараў, якія надаюць вадзе ўстойлівасць, акцэнт на злучанасці сімвалаў; зварот да канцэпцый утварэння светабудовы (зямлі і вады), яе раннеміфалагічнага мадэлявання. Уяўленні пра светабудову (зямлю і ваду), язычніцкую карціну свету, пашыраны вобраз, адвечны сімвал, трывалы і ўстойлівы код і суадносіны паміж даследуемымі архетыпамі – аснова сістэмнага разгляду генезісу і функцыянавання вобраза вады, воднай прасторы, іх значэнне ў міфалогіі славянскіх народаў – важнейшы сродак устойлівага ўяўлення свету на аснове яе паступовага пазнання праз адпаведныя сімвалы [А-2, А-3, А-6, А-12, А-16, А-24, А-26].

3. Асноўным для фарміравання ўяўлення аб воднай прасторы ў беларускай вуснапаэтычнай творчасці выступае комплекс анталагічных і

прагматычных прыкмет, якія характарызуюць ваду ў розных аспектах (стан, якасныя і колеравыя параметры). Найбольш важныя (і абавязковыя) прынцыпы класіфікацыі вады – адвеку сфарміраваная сімвалічна-міфалагічная аналогія адносін і характарыстык, якія пастаянна змяняліся ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу і новых абставін (сацыяльна-духоўных).

Водная прастора персаніфікавалася і ўяўляла сабой стыхію, якая ў народнай міфалогіі і фальклоры асацыіравалася ў людзей з выратавальнай сілай, якую шанавалі і якой пакланяліся. Продкі былі ўпэўнены, што могуць засцерагчы не толькі сябе, але і сваіх блізкіх (вымаўляючы магічныя словы замоў) ад розных негатыўных жыццёвых сітуацый.

Аналіз фальклорна-міфалагічнага матэрыялу і яго параўнанне, атрыманыя вынікі дазваляюць зрабіць выснову, што гідралагічны код, які ўзаемадзейнічае з іншымі найбольш архаічнымі кодамі, і займае адно з галоўных месцаў.

Пакланенне вадзе, вера ў яе ачышчальныя, апатрапеічныя, лекавыя і прадукавальныя ўласцівасці, цудадзейную магічную сілу яе ўздзеяння ўстойліва захоўваюцца ў традыцыйнай сістэме поглядаў беларусаў. Рытуальна-магічныя дзеянні, звязаныя з вадой, знайшлі міфапаэтычнае ўвасабленне ў радзінна-хрэсьбіннай абраднасці (абмыванне вадой нованароджанага, паліванне крынічнай вадой на рукі жанчыны-парадзіхі і бабкі-павітухі, абмыванне парадзіхі і бабкі-павітухі), пахавальных абрадах і звычаях (хто падыходзіў да вады, палівалі на рукі тры разы ці прымушалі змачыць іх тройчы ў пасудзіне, потым давалі выцірацца «пахавальным ручніком»), каляндарна-абрадавай паэзіі (рытуалы з выкарыстаннем замоўленай вады на Юр'я, рытуальнае купанне, абмыванне ў Чысты чацвер, на Купалле), замовах (замоўленая вада выковае ачышчальную і лекавую функцыі, выступае ў ролі медыятара) [А-5, А-10, А-14, А-15, А-17, А-21, А-23, А-26].

4. Вада, водная прастора ўспрымаліся нашымі продкамі як персаніфікаваная стыхія, якую яны маглі ўпрасіць або запалохаць. З цягам часу складаліся розныя прыкметы і павер'і, узнікалі абрады і рытуалы, звязаныя з прадказаннем дажджу і яго спыненнем. Правядзенне абрадаў вызначаецца сінтэзам сімвалічных дзеянняў, вербальных і іншых элементаў, кожны з якіх выконвае вызначаную задачу і цесна ўзаемазвязаны з іншымі. Таму адзначым, што водная прастора як стыхія ў старажытныя часы ўплывала на фарміраванне ў людзей наіўнага светапогляду на навакольны свет.

У прашчураў важнае месца таксама займалі святыя крыніцы, якія атаясамліваліся ў іх з ачышчэннем цела, яго вылячэннем і выздараўленнем. Шырокае выкарыстанне ў назвах крыніц і азёраў Беларусі мела назва Святое, што сведчыць пра пакланенне воднай стыхіі, наданне ёй ачышчальных і лекавых функцый [А-3, А-5, А-7, А-16, А-19, А-20].

5. У будзённым жыцці чалавека вадзе надавалася важнае значэнне, асабліва з улікам шматлікіх лекавых, вылячальных, замоўных функцый вадкасці, якія з цягам часу ўводзіліся людзьмі ў ранг культаў, рытуалаў. Продкі заўсёды шанавалі, абагаўлялі ваду, пакланяліся ёй. Усё гэта знайшло сваё адлюстраванне ў розных жанрах беларускага фальклору. Абрады выконвалі ахоўную і ачышчальную функцыі, рытуальныя дзеянні і славесныя творы былі скіраваны на тое, каб абараніць чалавека і яго маёмасць ад небяспечных прыродных і розных жыццёвых абставін і з’яў. Ачышчэнне вадой ўяўлялася вынікам выгнання “чужых” сілаў пры дапамозе магічных дзеянняў і вербальных тэкстаў, уласцівасцей прадметаў, незвычайных здольнасцей асобных людзей

Дунай як рэальная рака ў беларускім фальклоры (балады, казацкія, рэкруцкія, салдацкія песні) асэнсоўваецца як сімвалічная мяжа паміж народамі, краінамі, паміж светам жывых і памерлых, парушэнне якой прыводзіла да ваенных канфліктаў, успрымалася як сімвалічны цэнтр, за якім знаходзіцца таямнічая зямля, як размежаванне сваёй і чужой тэрыторыі, як алегарычны вобраз смерці. Фальклорныя матэрыялы – аб’ектыўнае пацвярджэнне таго, што водная прастора як прыродна-касмічная стыхія ўплывала на фарміраванне ў продкаў міфалагічнага светапогляду [А-2, А-3, А-4, А-7, А-10, А-12, А-14, А-16, А-18].

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў дысертацыі

Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання атрымалі ўкараненне ў адукацыйным працэсе ўстаноў адукацыі “Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт” (акт ад 22.05.2023), ДУ “Цэнтралізаваная сістэма публічных бібліятэк г. Мінска” бібліятэка-філіял №2 імя Н.К. Крупскай (акт ад 24.02.2023).

Матэрыялы даследавання выкарыстоўваюцца ў межах выкладання вучэбнага прадмета (акт ад 22.05.2023) “Беларуская мова. Прафесійная лексіка”, “Беларуская мова і культура маўлення” (“Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт”)

Матэрыялы даследавання выкарыстоўваліся ў межах вучэбнага працэсу школьнага лагера СШ №66 г. Мінска (акт ад 24.02.2023) і будуць выкарыстоўвацца ў бягучым навучальным годзе.

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы спецкурсаў па духоўнай культуры, фальклярыстыцы, этнаграфіі, падрыхтоўцы фальклорна-этнаграфічных зборнікаў, падручнікаў і метадычных дапаможнікаў для навучэнцаў, студэнтаў гуманітарных спецыяльнасцей ВНУ, настаўнікаў і работнікаў устаноў адукацыі і культуры, дзяржаўнымі ўстановамі культуры, работнікамі цэнтраў фальклору, аддзелаў культуры ў паўсядзённай практыцы.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

***Кніжныя выданні***

1-А.Ненадавец, А.М. Лавіся, рыбка, вялікая і малая / А.М. Ненадавец, Я.А. Ненадавец. – Мінск : Беларуская навука, 2020. – 287 с. : іл. – (Традыцыйны лад жыцця).

***Раздзел у калектыўнай манаграфіі***

2-А.Ненадавец, Я.А. Тэма вады і воднай прасторы ў беларускім фальклоры / Я.А. Ненадавец // Навуковыя працы кафедры грамадскіх дысцыплін і права Бабруйскага філіяла УА БДЭУ / А. М. Ненадавец [і інш.] ; навук. рэд. А. М. Ненадавец. — Чарнігаў : Всесвіт, 2012. — С. 447–530.

3-А.Ненадавец, Я.А. “Нябесная” і “зямная” вада ў беларускім фальклоры / Я.А. Ненадавец // Навуковыя працы кафедры грамадскіх дысцыплін і права Бабруйскага філіяла УА БДЭУ / А. М. Ненадавец [і інш.] ; навук. рэд. А. М. Ненадавец. — Чарнігаў : Всесвіт, 2014. — С. 424–446.

***Артыкулы ў рэцэнзуемых навуковых выданнях Рэспублікі Беларусь***

4-А.Ненадавец, Я.А. Дунай як міфічны вобраз родава-сямейнай мяжы ў свядомасці беларусаў / Я.А. Ненадавец // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск, 2010. – Вып. 8. – С. 411–414.

5-А.Ненадавец, Я.А. Жывая і мёртвая вада ў беларускіх замовах і чарадзейных казках / Я.А. Ненадавец // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. Гуманитарные науки. – 2011. – № 2. – С. 122–126.

6-А.Ненадавец, Я.А. Абагаўленне воднай стыхіі ў беларускім фальклоры / Я.А. Ненадавец // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск, 2011. – Вып. 10. – С. 412–416.

7-А.Ненадавец, Я.А. Уяўленні пра веснавы дождж у беларускім фальклоры / Я.А. Ненадавец // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і

фальклору імя К. Крапівы ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск, 2011. – Вып. 11. – С. 431–434.

8-А. Ненадавец, Я.А. Вобраз вады, воднай прасторы ў малых жанрах беларускага фальклору / Я.А. Ненадавец // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2015. –Вып. 19. – С. 262–266.

9-А. Ненадавец, Я.А. Тэма вады, воднай прасторы ў працах фалькларыстаў XIX – пач. XXI ст. / Я.А. Ненадавец // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2015. Вып. 19. – С. 266–271.

10-А.Ненадавец, Я.А. Рытуальнае выкліканне дажджу ў беларускім фальклоры / Я.А. Ненадавец // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2016. –Вып. 21. – С. 216–221.

11-А.Ненадавец, Я.А. Сімвалічны вобраз Дуная ў фальклорных запісах Яна Чачота / Я.А. Ненадавец // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2017. – Вып. 22. – С. 360–365.

12-А.Ненадавец, Я.А. Семантыка Дуная ў беларускіх баладах / Я.А. Ненадавец // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2018. – Вып. 24 – С. 306–310.

13-А.Ненадавец, Я.А. Капанне студняў у 50-70-я гады XX ст. на Піншчыне паводле фальклорных матэрыялаў / Я.А. Ненадавец // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2023. Вып. 34. – С. 522–530.

***Матэрыялы канферэнцый***

14-А.Ненадавец, Я.А. Міфічны Дунай – фальклорны абмежавальнік родавых земляў / Я.А. Ненадавец // Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX-XX стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы : зб. Навук. Арт. : у 2 ч. / рэдкал.: В.А. Міхедзька (адк. рэд.) [і інш.]; М-ва

адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзярж. Ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель, 2009. – Ч.2 – С. 65–70.

15-А.Ненадавец, Я.А. Тэма жывой вады ў беларускіх казках і ў «Казках жыцця» Якуба Коласа / Я.А. Ненадавец // Якуб Колас і яго сучаснікі: да вывучэння беларускіх і іншанацыянальных літаратурных і культурных узаемасувязей : матэрыялы XXIV навук. Канф., прысвеч. 50-годдзю з дня адкрыцця Дзярж. Літ.-мемар. Музея Якуба Коласа, Мінск 3 лістап. 2009 г. / склад.: З.М. Камароўская, Г.І. Зайцава. – Мінск, 2010. – С. 67–72.

16-А.Ненадавец, Я.А. Міфічны Дунай у беларускіх лірычных песнях / Я.А. Ненадавец // Фальклардыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зб. арт. / пад навук. рэд. Р.М. Кавалёвай, В.В. Прыемка. – Мінск, 2010. – Вып. 7. – С. 102–109.

17-А.Ненадавец, Я.А. Значэнне воднай прасторы ў беларускіх замовах / Я.А. Ненадавец // Роля традыцый народнай культуры ў адраджэнні беларускага сяла : матэрыялы Рэспублік. Навук.-практ. Канф, Іванава 24 верасня 2010 г., / НАН Беларусі Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы; гал. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск, 2010. – С.146–149.

18-А.Ненадавец, Я.А. Вобразы рэчак і ручаін у зборніку «Песні-жальбы» Якуба Коласа / Я.А.Ненадавец // Якуб Колас і яго сучаснікі : да вывучэння творчых і асабістых узаемасувязей пісьменніка : матэрыялы XXV навук. канф., Мінск 3 лістап. 2010 г., / склад. : З.М. Камароўская, Г.І. Зайцава. – Мінск, 2011. – С.152–156.

19-А.Ненадавец, Я.А. Вада як ачышчальна-засцерагальная сіла ў беларускім фальклоры / Я.А. Ненадавец // Этнокультурное развитие Беларуси в XIX – начале XXI в. : материалы Междунар. науч.-практ. конф., г. Минск 19-20 мая 2010 г., / редкол.: Т.А. Новогродский (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2011. – С. 106–110.

20-А.Ненадавец, Я.А. Фальклорны матыў у вершы «Ручэй» Якуба Коласа / Я.А. Ненадавец // Каласавіны. Якуб Колас і яго сучаснікі : да вывучэння творчых і асабістых узаемасувязей пісьменніка : матэрыялы XXVI навук. канф., Мінск 4 лістап. 2011 г., / склад. : З.М. Камароўская, Г.І. Зайцава. – Мінск, 2012. – С.256-260.

21-А.Ненадавец, Я.А. Вобраз «жывой» і «мёртвай» вады ў беларускіх чарадзейных казках / Я.А. Ненадавец // Міжнар. Шамякінскія чытанні. «Пісьменнік – асоба – час» : матэрыялы III Міжнароднай навук.-практ. канф., Мазыр, 27 верасня 2013 г. – Мазыр, 2013. С. 113–116.

22-А.Ненадавец, Я.А. Нёман у дакастрычніцкіх апавяданнях Якуба Коласа / Я.А. Ненадавец // Каласавіны. Якуб Колас. Чалавек. Эпоха. Час :

матэрыялы XXVII навук. Канф., прысвечанай 130-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа, Мінск 2-3 лістапада 2012 г., – Мінск, 2013. – С. 187–194.

23-А.Ненадавец, Я.А. Жывая і мёртвая вада ў беларускіх казках / Я.А. Ненадавец // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў. Мінск, 19-20 лістапада 2015 г. гал. рэд. А.І. Лакотка ; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. Мінск – 2016. С. 510-513.

24-А.Ненадавец, Я.А. Тэма рыбалоўства ў працах М. Нікіфароўскага і К. Тышкевіча / Я.А. Ненадавец // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў. Мінск, 12-13 верасня 2019 г. гал. рэд. А.І. Лакотка ; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. Мінск – 2021. С. 542-544.

25-А.Ненадавец, Я.А. Прадказанні і павер'і, звязаныя з рыбалоўствам / Я.А. Ненадавец / Навуковая спадчына В.К. Бандарчыка : зб. матэрыялаў рэспублік. навук.-практ. канф., г. Слуцк, 8 кастр. 2020 г. – Мінск, 2022. – С. 298–305.

26-А. Ненадавец, Я.А. Ачышчальная функцыя вады (паводле матэрыялаў, атрыманых падчас палявых экспедыцый па Піншчыне) / Я.А. Ненадавец // Беларуская этнаграфія, этналогія і антрапалогія : зб. навук. арт. / уклад. А. У. Гурко ; Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр দаслед. беларус. культуры, мовы і літ. – Мінск : Беларус. навука, 2023. – Вып. 2. – С. 99–113.

## РЭЗЮМЭ

**Ненадавец Ягор Аляксеевіч**

**Водная прастора ў беларускім фальклоры: семантыка, сімволіка, функцыянальнасць**

*Ключавыя словы*: паэтыка, вада, водная прастора, магічныя словы, архетып вады, нябесная вада, зямная вада, святыя азёры, святыя крыніцы, фальклорны сімвал, празаічныя жанры, малыя жанры, міфалагічныя ўяўленні, фальклор, міфалогія, вобраз-сімвал, рака-Дунай.

*Мэта даследавання:* выявіць генезіс, семантыку, сімволіку і функцыянаванне воднай прасторы як вобраза беларускага традыцыйнага фальклору на аснове навейшых дасягненняў айчыннай і замежнай фалькларыстыкі, культуралогіі, гісторыі, этналінгвістыкі.

*Метады даследавання:* тэарытычнай і метадалагічнай асновай сталі прынцыпы аб'ектыўнасці і навуковасці, сістэмна-гістарычны і комплексна-міфалагічны падыходы, якія ўключаюць у сябе структурна-тыпалагічны і параўнальна-гістарычны метады.

*Атрыманыя вынікі і іх навуковая навізна:* упершыню ў беларускай фалькларыстыцы праведзена комплекснае даследаванне вобраза вады і воднай прасторы ў нацыянальнай міфалогіі і вуснапаэтычнай творчасці, што дазволіла разглядаць яго як неад'емную частку самабытнай традыцыйнай культуры, функцыянальна скіраваную на глыбокае асэнсаванне стыхійных праяў рэальнага свету. Упершыню цэласна ахарактарызаваны павер'і пра ваду ў шэрагу каляндарных і сямейных абрадаў, у замовах, казках, прыкметах і павер'ях, прыказках і прымаўках выяўлена іх семантычная напоўненасць: раскрыты дамінантныя прыкметы, вызначана спецыфіка кампанентаў. Акрэслены сацыяльна-гістарычныя прычыны і напрамкі структурнай і змястоўнай трансфармацыі беларускіх абрадаў і жанраў фальклору, звязаных з вадой; выяўлены і прааналізаваны фальклорныя жанры ў складзе беларускіх абрадаў і сімвалічна-рытуальных дзеянняў, раскрыты адметнасці мастацкіх сродкаў вербальных тэкстаў беларускай народнай творчасці.

*Рэкамендацыі па выкарыстанні:* вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы спецкурсаў па духоўнай культуры, фалькларыстыцы, этнаграфіі, падрыхтоўцы фальклорна-этнаграфічных зборнікаў, падручнікаў і метадычных дапаможнікаў для навучэнцаў, студэнтаў гуманітарных спецыяльнасцей ВНУ, настаўнікаў і работнікаў установы адукацыі і культуры.

*Галіна выкарыстання:* фалькларыстыка, этнаграфія, культуралогія.

РЕЗЮМЕ

**Ненадовец Егор Алексеевич**

**Водное пространство в белорусском фольклоре: семантика, символика, функциональность**

*Ключевые слова:* поэтика, вода, водное пространство, магические слова, архетип воды, небесная вода, земная вода, святые озёра, святые источники, фольклорный символ, прозаические жанры, малые жанры, мифологические представления, фольклор, мифология, образ-символ, Дунай.

*Цель исследования:* раскрыть генезис, семантику, символику и функционирование водного пространства как образа белорусского традиционного фольклора на основе новейших достижений отечественной и зарубежной фольклористики, культурологии, истории, этнолингвистики.

*Методы исследования:* теоретической и методологической основой стали принципы обективности и научности, системно-исторический и комплексно-мифологический подходы, которые включают в себя структурно-типологический и сравнительно-исторический методы.

*Полученные результаты и их новизна:* впервые в белорусской фольклористике проведено комплексное исследование образа воды и водного пространства в народной мифологии и устно-поэтическом творчестве, что позволило рассматривать его как неотъемлемую часть самобытной традиционной культуры, функционально направленную на глубокое понимание естественных проявлений реального мира. Впервые комплексно охарактеризованы поверья о воде в ряде календарных и семейных обрядов, в пословицах и поговорках, сказках, приметах и поверьях: раскрыто их смысловое содержание и выявлены доминирующие признаки, определена специфика компонентов. Обозначены социально-исторические причины и направления структурной и содержательной трансформации белорусских обрядов и фольклорных жанров, связаных с водой; выявлены и проанализированы фольклорные жанры в составе белорусских обрядов и символико-обрядовых действий.

*Рекомендации по использованию:* Результаты исследования могут быть использованы при разработке спецкурсов по духовной культуре, фольклористике, этнографии, подготовке фольклорно-этнографических зборников, учебников и методических пособий для учащихся, студентов гуманитарных специальностей вузов, учителей и работников учреждения образования и культуры, государственными учреждениями культуры.

*Область использования:* фольклористика, этнография, культурология.

SUMMARY

**Nenadavets Yahor Aliakseevich**

**Water spase in the Belaruian folklore: semantics, symbolism, functionality**

*Key words:* poetics, water, water space, magic words, water archetype, heavenly water, earthly water, sacred lakes, sacred springs, folklore symbol, prose genres, minor genres, mythological ideas, folklore, mythology, image-symbol, Danube.

*The purpose of a thesis:* to reveal the genesis, semantics, symbolism and functioning of water space as an image of Belarusian traditional folklore based on the latest achievements of domestic and foreign folkloristics, cultural studies, history, ethnolinguistics.

*The methods of research:* the theoretical and methodological basis became the principles of objectivity and scientificity, systemic-historical and complex-mythological approaches, which include structural-typological and comparative-historical methods.

*Obtained results and their novelty:* for the first time in Belarusian folkloristics, a comprehensive study of the image of water and water space in national mythology and oral poetic creativity was carried out, which it possible to consider it as an integral part of original traditional culture, functionally aimed at a deep understanding of natural manifestations of the real world. For the first time, the beliefa about water in a number of calendar and family rites, in orders, tales, omens and beliefs, proverbs and sayings were comprehensively characterized, their semantic content was revealed: the dominant signs were revealed, the specifics of the components were determined. The socio-historical causes and directions of the structural and substantive transformation of Belarusian rites and folklore genres related to water are indicated; folklore genres as part of Belarusian rites and symbolic-ritual actions are indentified and analyzed.

*Recommendations for the use:* The results of the study of the archetype of water can be used in the development of special courses on spiritual culture, folkloristics, ethnography, preparation of folklore and ethnographic collections, textbooks and methodical manuals for pupils, students of humanitarian specialties, teachers and workers of educational and cultural institutions, workers of folklore centers, departments of culture in everyday practice

*Field of application:* folklore, ethnography, cultural studies